# «МАЯ РАДЗІМА—ІНДЫЯ...»



**На працягу амаль двух стагоддзяў англійскія каланізатары пазбаўлялі індыйскі народ элементарнай магчымасці развіваць сваю эканоміку, навуку, культуру.**

**Шматгадовая ўпартая барацьба індзійцаў, якую ўзначалілі Махатма К. Гандзі і Джавахарлал Неру, закончылася 15 жніўня 1947 года заваёвай Індыяй незалежнасці. 26 студзеня 1950 года ўпершыню быў падняты трохкаляровы сцяг Рэспублікі Індыя.**

**За гады незалежнасці, нягледзячы на ўпартае супраціўленне рэакцыі, Індыя дабілася значных поспехаў.**

**У гэтым годзе ў нашым універсітэце ўпершыню вучацца грамадзяне Рэспублікі Індыя. Вось што расказвае аб сваёй краіне аспірант кафедры фізікі цвёрдага цела СУД ПРЭМ КУМАР:**

— Мая Радзіма — Індыя — гэта вельмі вялікая і шматнацыянальная краіна.

26 студзеня 1950 г. Індыя стала рэспублікай. З таго часу гэты дзень адзначаецца па ўсёй краіне як вялікае нацыянальнае свята.

Атрымаўшы незалежнасць, Індыя дабілася значных поспехаў у палітычнай, эканамічнай, навуковай, культурнай і нацыянальнай сферах жыцця. Зараз Індыя адыгрывае важную ролю ў міжнародным жыцці.

Значных поспехаў дасягнула Індыя і ў эканамічным жыцці. Яна змагла ў многіх галінах дабіцца незалежнасці ад замежнага капіталу. Напрыклад, зараз наша краіна забяспечвае не толькі сябе такімі таварамі, як сталь, станкі, вагоны, медыкаменты, сахар, але і экспартуе іх у многія краіны свету. Нашу сталь купляе нават такая развітая краіна, як Японія.

У галіне навукі мы таксама дабіліся вялікіх поспехаў.

У мінулым годзе нашы вучоныя пры дапамозе савецкіх калег здзейснілі запуск штучнага спадарожніка Зямлі. На тэрыторыі Індыі зараз будуецца чацвёртая атамная электрастанцыя. Паспяхова прайшлі выпрабаванні першага аўтамабіля з атамным рухавіком.

Зараз амаль у кожнай вёсцы ёсць школа. Навучанне ў дзяржаўных школах бясплатнае. Усе дзеці маюць права вучыцца. У школе вывучаюць не толькі фізіку, хімію, матэматыку, гісторыю, мовы, але і нацыянальнае прыкладное мастацтва, танцы, спевы. Зараз у Індыі студэнты вучацца у 90 універсітэтах і 4.500 каледжах.

На жаль, я не магу сказаць, што навучанне ў каледжах і універсітэтах таксама бясплатнае. Але тым не менш студэнты, якія добра вучацца, атрымліваюць стыпендыю.

З кожным днём розніца паміж кастамі, паміж беднымі і багатымі становіцца ўсё меншай, хаця спатрэбіцца яшчэ шмат часу, каб мы зусім пазбавіліся гэтага.

Наша моладзь прымае актыўны ўдзел у будаўніцтве новай Індыі. У краіне існуюць маладзёжныя арганізацыі. Прадстаўнікі маладзёжных, студэнцкіх арганізацый уваходзяць у састаў адміністрацыйных органаў заводаў, фабрык, у акадэмічныя саветы універсітэтаў і каледжаў.

Дзякуючы дапамозе савецкага народа, мы за кароткі час дабіліся вялікіх поспехаў. Металургічныя камбінаты ў Бхілаі і Бакаро, заводы цяжкага машынабудавання ў Ранчы і Хардвары, фармацэўтычныя заводы ў Хайдэрабадзе і Рышэкеме, геалагічная разведка нафты і вугалю, штучны спадарожнік Зямлі — гэта толькі невялікая частка таго, што мы зрабілі з дапамогай Савецкага Саюза.

Цяпер я вучуся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Буду тут чатыры гады. За першыя чатыры месяцы я ўжо шмат даведаўся аб гісторыі вашай краіны, убачыў, як жывуць вашы людзі, як вучыцца моладзь. Я зачараваны тымі магчымасцямі, умовамі, якія ствараюцца ў вашай краіне для таго, каб маладыя людзі маглі вучыцца. Мне падабаецца горад-герой Мінск, падабаецца, што жыхары яго натхнёна працуюць, каб падтрымаць добрую славу свайго горада і зрабіць яго яшчэ лепшым.



НА ЗДЫМКАХ: Суд Прэм Кумар у лінгафонным кабінеце; грабніца Тадж-Махал (1652 г.) у Індыі.

Фота У. БУДАЯ.

# ІНТЭРНАТ— ТВОЙ ДОМ

Цярушыць над Паркавай белы сняжок. Спяшаюцца ў інтэрнат юнакі і дзяўчаты. Заглянем разам з імі ў чытальную залу — яна перапоўнена. Уважліва схіліліся студэнты над старонкамі падручнікаў і канспектаў. Усе старанна рыхтуюцца да экзаменаў.

Я наведаў некалькі пакояў інтэрната. Зайшоў і да старшыні студсавета Уладзіміра Рудкоўскага.

— Як у вас ідуць справы, Валодзя?

Ужо здадзены ўсе залікі, засталіся перадэкзаменацыйныя хваляванні.

Мы разгаварыліся, і ён пазнаёміў мяне з работай студсавета. У кастрычніку Валодзю абралі старшынёй. З таго моманту прайшоў і не такі доўгі час, але па тым, як рабяты ўзяліся за выкананне сваіх абавязкаў, можна меркаваць пра многае.

— Якая ж галоўная задача студсавета? — пацікавіўся я.

— Вялікую ўвагу мы ўдзяляем культурнаму адпачынку студэнтаў, сочым за захоўваннем прынцыпаў студэнцкага супольнага жыцця, за выкананнем сацабавязацельстваў. Дэвізам студэнтаў павінны стаць словы: «Інтэрнат —твой дом, жыві так, каб іншым было прыемна жыць з табой».

Зараз, калі ідзе сесія, мы стараемся дапамагчы студэнтам як мага лепей падрыхтавацца да экзаменаў, запрашаем у інтэрнат выкладчыкаў, якія даюць кансультацыі, праводзяць гутаркі і лекцыі. Так, напрыклад, філолагі ў снежні правялі вечар пытанняў і адказаў.

Пераважная большасць членаў студсавета — юрфакаўцы. Яны ўважліва сочаць за санітарным станам пакояў і агульным парадкам у інтэрнаце. Наогул, клопатаў хапае. Зусім нядаўна быў праведзены конкурс на лепшае афармленне пакоя. Ня дрэннымі гаспадынямі паказалі сябе дзяўчаты з філфака з 419, юрфака— з 219 і 105 пакояў.

Вось так і жывём. Ну, а ацаніць работу студсавета лепш за ўсіх могуць самі жыхары.

— Па-мойму, выдатна. Мы ўсе задаволены, — гаворыць Таня Сухадолава, і гэтыя словы пераклікаюцца з адказамі многіх студэнтаў, да якіх я звярнуўся з тым жа пытаннем. Задаволена работай студсавета і адміністрацыя інтэрната, з якой існуюць моцныя кантакты.

І так — дзень за днём.

**М. БАЖКО,**
**студэнт I курса журфака.**



Экзамен па матэматычнаму аналізу здае студэнт II курса ФПМ Тонеў Пётр Тонеў (Балгарыя). Фота У. БУДАЯ.

АГЛЯД ДРУКУ

# КУДЫ ПАДЗЕЛАСЯ СЕСІЯ?

МОЖА, гэта і недарэчы рабіць агляд друку ў самы разгар экзаменаў, але на тое, як кажуць, вымусілі абставіны. І гэтымі абставінамі з'явілася сама сесія. Не будзем паўтараць прапісную ісціну, што сесія—адно з галоўнейшых звенняў вучэбнага працэсу і што ёй павінна ўдзяляцца самая пільная ўвага.

Ісціна таму так і завецца, што яе ведаюць і разумеюць усе. Някемлівых зараз адшукаць цяжка, асабліва сярод людзей з вышэйшай адукацыяй.

Але вось мы ходзім па факультэтах, разглядаем стракатыя насценныя газеты і здзіўляемся — не, не разумеюць прапісных ісцін рэдкалегіі. А можа на гэтых факультэтах няма сесіі?

«Алгарытм» — вясёлы, дасціпны нумар: іменна такой і павінна быць навагодняя газета. Але ж пасля Новага года пачынаюцца экзамены. А яны на ФПМ нялёгкія. І тым не менш—ніякіх намёкаў на сесію ні ў газеце, ні ў яе дадатку няма.

«Савецкі юрыст». Тут намёкі ў выглядзе жартаў тыпу «Лезці ў нетры—цягнуць білет» ёсць. Але далей справа не пайшла.

Насценгазета «Хімік» не дае абыякава прайсці міма. Яркія малюнкі, перасыпаныя бліскучым шклом, рознакаляровыя шары, зялёная ёлка, на фоне якой— фотаздымкі з агляду мастацкай самадзейнасці. Новы год, пажаданні прыемна яго сустрэць, адпачыць... І гэта ўсё? Не, мабыць з-за мноства малюнкаў мы нешта ўпусцілі. Прабягаем вачыма па лістку насценгазеты яшчэ раз. Няма сесіі. Адгукніся, рэдкалегія, як справы ў студэнтаў?

Вы бачылі насценгазету геафака? Не? Яна ж вісела на трэцім паверсе геаграфічнага корпуса амаль да Новага года: той самы нумар, у якім пісалася аб сельгасработах — «Эх, бульбачка...» За гэты тэрмін яе можна было вывучыць напамяць. А дзе ж «Мерыдыян» зараз? Замест факультэцкай газеты вісіць на сцяне нейкі незвычайнага віду лісток, адна палова якога прысвечана жанчынам, другая — віншаванням з Новым годам і маленькім гумарыстычным вытрымкам. Можа, гэта «баявы лісток» (хаця на «баявы» ён наўрад ці падобны)? Хутчэй за ўсё лісток разлічаны на самага кемлівага чытача, бо ні даты, ні назвы, ні імя таго, хто падрыхтаваў выпуск, няма: здагадайся сам.

«Першую ластаўку» мы знайшлі ў насценгазеце матэматыкаў «Рошым любую задачу». Пачыталі цёплыя словы пажаданняў на дарогу першакурснікам, элегічныя разважанні «Што такое дзень экзамена...» — жартаўлівае эсэ з сур'ёзнымі і дзелавымі парадамі студэнтам. І хоць відавочна, што ўсё гэта можна было змясціць у газеце і сёння, і дзесяць год назад, але за парады «дзякуй».

Сустракаюцца невялікія матэрыялы на перадэкзаменацыйныя тэмы ў «Віце»—насценгазеце біёлагаў.

Крыху лепш абстаяць справы ў журналістаў: мемуары першакурсніка С. Кучынскага «Першы залік», фотарэпартаж В. Рошчына «Ну, вось і экзамены». Фотаздымкі не бог ведае якія, але затое з цудоўнымі сюжэтамі.

Усё. Больш нідзе, ні ў «Гісторыку», газеце добрай і змястоўнай, ні ў «За навуку»—насценгазеце фізікаў, якая ў мінулым годзе заняла першае месца... Прабачце, гэту газету, агледзеўшы другі, трэці і чацвёрты паверхі фізічнага корпуса, мы не знайшлі. Можа, яна дзе і вісіць, можа, нарэшце, у ёй мы і ўбачылі б сур'ёзныя артыкулы работнікаў дэканата, цікавыя фотаздымкі, інтэрв'ю і сатырычныя малюнкі на экзаменацыйныя тэмы. Хочацца мець такую надзею...

Мы прадбачылі пярэчанні членаў рэдкалегій пералічаных газет. Цяжка зрабіць нумар у сесію, бо самі члены рэдкалегіі—студэнты, і ім таксама трэба рыхтавацца да экзаменаў. Але ж і насценгазета не павінна быць у заняпадзе. Толькі высокая арганізаванасць працы дапаможа зрабіць так, каб, як кажуць, і ваўкі былі сытыя і авечкі цэлыя. І яшчэ. На гістфаку мы знайшлі «Маланку», выпушчаную штабам «КП». Студэнты II курса аддзялення палітэканоміі — лепшыя з лепшых—вельмі дрэнна здалі экзамен па статыстыцы. «Вам не сорамна?» — пытаўся плакат. Напэўна, сорамна, і, напэўна, наступны экзамен група здасць намнога лепш. А хто дапамог? Друк! Чаму ж на іншых факультэтах не могуць аператыўна асвятляць незвычайныя прыемныя і непрыемныя падзеі? Хіба пераваліся карыкатурысты, ніхто не можа трымаць у руках фламайстар?!

Вісяць газеты... Расказваюць пра палітінфармацыі, спартыўныя навіны, замежныя кантакты; многа гумару. А сесіі—няма. І з вопыту ведаем—не будзе. Хіба толькі ў лютым—красавіку паявяцца ў газеце статыстычныя даныя па экзаменах, дэканат дасць сухую даведку, і—тэма закрыецца.

У чым жа справа? Няма часу—пустая адгаворка. А можа, здарылася так, як у тым жарце пра экзамен: «Не заўсёды спадзявайся на суседа. Магчыма, ён паспадзяваўся на цябе»...

**І. САВЕТКІНА,**
**С. УСЦІНОВІЧ.**

# СЕСІЯ, СЕСІЯ, СЕСІЯ, СЕСІЯ!

## ЦІШЭЙ, ІДЗЕ ЭКЗАМЕН!

Вось і застракацелі на дзвярах таблічкі з надпісам «Цішэй, ідзе экзамен!» Сесія. Яна пануе цяпер і ў бібліятэках, і ў лабараторыях, і у кабінетах і аўдыторыях. Напружаная праца адчуваецца ўсюды. Як жа падрыхтаваліся да сесіі факультэты універсітэта?

**І. О. Царук, дэкан гістарычнага факультэта:**

— Падрыхтоўка да сесіі, вядома, пачалася ўжо даўно. Перш-наперш быў зроблены расклад залікаў, экзаменаў, кансультацый. На спецыяльным пасяджэнні дэканата абмяркоўваліся галоўныя пытанні сесіі. Партыйны сход, савет і студэнцкі актыў вызначылі найбліжэйшыя задачы работы факультэта ў гэты адказны перыяд. Акадэмічная камісія ў снежні разгледзела бягучую паспяховасць студэнтаў, высветліла цяжкасці, якія ўзнікаюць пры здачы экзаменаў па прычыне недапрацоўкі студэнтаў у семестры. Камісія размеркавала абавязкі кафедр, непасрэдна выкладчыкаў і студэнтаў у плане дапамогі непаспяваючым.

Вялікую ўвагу ўдзяляем мы першакурснікам, таму што першая сесія для іх пакуль што самая цяжкая. На факультэце дзейнічае метадычная камісія.

Вынікі сесіі пакуль што нельга падвесці, але некаторыя курсы факультэта ўжо здалі ўсе экзамены і, трэба адзначыць, здалі паспяхова.

**Г. А. Варабей, намеснік дэкана факультэта па навучанню замежных грамадзян:**

— Галоўная цяжкасць работы з замежнымі студэнтамі заключаецца у тым, што яны ўсе «раскіданы» па розных факультэтах. Акрамя таго, першакурснікі прыходзяць да нас з рознай моўнай падрыхтоўкай, і за перыяд першага семестра яны павінны больш-менш падняцца па веданню рускай мовы да узроўню студэнтаў старэйшых курсаў факультэта. Вялікую дапамогу ў гэтым аказваюць кансультацыі, якія праводзяцца на кафедры рускай мовы. У перыяд сесіі для замежных студэнтаў праводзяцца спецыяльныя кансультацыі па агульных дысцыплінах, у падрыхтоўцы да экзаменаў значную дапамогу аказваюць савецкія студэнты. На партыйным сходзе, які праходзіў сумесна са студэнтамі-камуністамі з ГДР, абмяркоўваліся пытанні вучобы, наведвання лекцый студэнтамі, задачы, якія трэба вырашыць у час сесіі.

**Н. С. Мажэйка, дэкан завочнага факультэта:**

— Для арганізацыі самастойных заняткаў студэнтаў і аказання ім максімальнай дапамогі вядзецца вялікая міжсесійная работа. Сесія, падрыхтоўка і яе правядзенне былі пытаннем спецыяльнага абмеркавання на сходах, савеце, на пасяджэнні метадычнай камісіі. Вялікая ўвага ўдзяляецца сістэматычнаму кантролю за своечасовым і якасным рэцэнзіраваннем кантрольных работ. Штотыднёва на факультэцкіх сходах ставяцца пытанні аб павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю. Мы падтрымліваем пастаянную сувязь з прадпрыемствамі і установамі, дзе працуюць студэнты-завочнікі, устанаўліваем цесныя кантакты з іх кіраўніцтвам з мэтай інфармавання аб вучобе студэнтаў. Як і ўсюды, галоўная ўвага — першакурсніку. Выпушчана перапрацаванае выданне «Памяткі студэнту», у якой указаны правы і абавязкі студэнта-завочніка. Сістэматычна праводзяцца пісьмовыя і вусныя, калектыўныя і індывідуальныя кансультацыі, дні завочніка.

Каб пазбегнуць зрываў у сесійны перыяд, завочны факультэт працуе штодзённа, уключаючы і выхадныя дні.

**С. ІВАНОВА.**

## У КРАІНЕ «ШЧАСЛІВЫХ БІЛЕТАЎ»

З БЕЗНАДЗЕЙНЫМ стараннем звініць званок. Ад яго адмахваюцца, як ад дакучлівай мухі, — заняткі даўно скончыліся. Сёння — сесія. Тая, што, як пяецца ў песні, «усяго два разы ў год» і якую называюць крытэрыем ведаў.

Нам пашанцавала. У пошуках самага звычайнага экзамена мы натрапілі на чацвёртакурснікаў фізічнага факультэта (аддзяленне радыёфізікі), якія здавалі Уладзіміру Андрэевічу Кулажанку, кандыдату эканамічных навук, дацэнту, курс «Палітэканомія сацыялізму».

Да пачатку экзамена заставалася некалькі хвілін, і ў цесным коле самых-самых першых студэнтаў вялася дыскусія, дзе Уладзімір Андрэевіч пакладзе «шчаслівыя» білеты.

8.30. Старт! Да стала экзаменатара працягнуўся ланцужок першаадкрывальнікаў. Залікоўка і канспект — на стол, сабе — беласнежны экзаменацыйны білет. Вось ён, твой сённяшні лёс. Хутчэй, хутчэй прачытаць, пераканацца, што незнаёмых слоў у білеце няма.

Задуменна гартаюцца праграмкі курса. Зараз галоўнае — засяродзіцца, сканцэнтраваць волю і памяць на вырашэнні пытанняў білета. Міжволі заўважаеш: хлопцы з першай пяцёркі — сапраўдныя «рыцары»: самі занялі кругавую абарону на «камчатцы», а дзяўчат прапусцілі на пярэднія парты.

Цішыню парушае голас экзаменатара:

— Міхаіл Караваеў!

Адказ Мішы — дадатковае сведчанне таго, што на экзамене можна і ўспомніць папярэдні курс, і нават паспрачацца з выкладчыкам. Бо экзамен— справа творчая.

— Пры маральным зносе вартасць.., — пачаў было студэнт і замаўчаў, пачаў пераводзіць гутарку на другія паняцці.

— Ну, дык што бывае пры маральным зносе?

Уладзімір Андрэевіч накіроўвае плынь экзамена ў патрэбнае рэчышча. Сёння ён рулявы. Хутка ў залікоўцы Караваева паяўляецца «чацверка»—пачатак пакладзены.

Анатолій Шарэнда, наступны з першай пяцёркі, адказвае спакойна, стала, разважліва. Потым, ужо пасля экзамена, мы спыталі, як ён рыхтаваўся да палітэканоміі. Усміхнуўся:

— Прачытаў усё і запомніў.

Не, не толькі прачытаў, але і паспрабаваў разабрацца ў грамадскай навуцы, дакапацца да сутнасці пытанняў. А яшчэ зусім просты сакрэт: рэгулярная падрыхтоўка да палітэканоміі на працягу семестра.

Захацелася даведацца больш пра гэтага студэнта. Закончыў ён школу-інтэрнат у Полацку. Медаліст? Не, меў адну «чацвёрку» па чарчэнню. Ва універсітэт паступіў адразу пасля школы. Што выбраў? Радыёфізіку. Ну, а грамадскія навукі?..

— Я адношуся да той катэгорыі фізікаў, якія лічаць гэтыя навукі вельмі карыснымі для сябе.

Гэта ўсё было пасля экзамена. А пакуль што Уладзімір Андрэевіч старанна выпісвае ў залікоўцы Анатоля «выдатна».

Пройдзе некалькі гадзін, і за гэты час многія вось так з заміраннем сэрца будуць глядзець, як рука экзаменатара выводзіць першую адзнаку сесіі. А гэта адзнака ў Вольгі Канаплянік, Уладзіміра Маслава, Леаніды Лаўрэнцьевай і іншых будзе выдатнай.

— А як там Раіса?

Раіса Фурэт прыехала ў Мінск з Кубы. Перад экзаменам вельмі хвалявалася.

— «Выдатна»!

На ўвесь твар — белазубая ўсмешка.

— Палітэканомію сацыялізму я вучыла з вялікім інтарэсам — яна мне ў будучым спатрэбіцца. Пройдзе паўтара года, і я закончу універсітэт. Мару працаваць інжынерам на атамнай электрастанцыі, якую будуе наш народ з дапамогай брацкага савецкага народа.

А экзамен тым часам працягваецца. Уваходзяць засяроджаныя, пасур'ёзнеўшыя. Залікоўку — на стол, сабе — білет. Выходзяць расчырванелыя, шчаслівыя.

...А за сцяной у аўдыторыі апошні раз гартаюцца канспекты, правяраецца надзейнасць аўтаручак, даюцца апошнія парады на экзамен.

Падыходзім да тых, хто здаў:

— Ну, дык дзе хавае экзаменатар «шчаслівыя» білеты?

— Што вы! Яны ўсе шчаслівыя і лёгкія, калі здасі!

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

**На здымках:**

Уладзімір Андрэевіч удакладняе.

Рыхтуюць адказы самыя першыя.

Фота **А. Цыгулёва.**





## НЕКАЛЬКІ ПАРАД СТУДЭНТАМ

У поўным разгары гарачая студэнцкая пара — зімовая экзаменацыйная сесія. Як заўсёды, асабліва напружаная яна для першакурснікаў. І зараз, мабыць, знойдзецца дзесятак-другі рабят, якіх вельмі збянтэжылі вынікі іх першых студэнцкіх экзаменаў...

Як жа так? У школе быў не з апошніх, заветны прахадны бал набраў без асаблівых намаганняў — а тут «двойка», ды не адна. У дзевяці выпадках з дзесяці вінавата у гэтым не адсутнасць здольнасцей, а няўменне арганізаваць сваю працу.

У час экзаменаў трэба некалькі перабудаваць свой рэжым. Рабочыя перыяды мэтазгодна зрабіць больш працяглымі, раздзяліўшы дзень прыблізна так: ад снедання да абеду, ад абеду да вячэры і ад вячэры да сну. Кожны такі перыяд заканчвайце хоць бы кароткай прагулкай на паветры.

Спіце па-ранейшаму 8 або хаця 7 гадзін. Не заседжвайцеся позна, падбадзёрваючы сябе па вечарах моцнай кавай і чаем. З-за гэтага у вас можа прапасці сон, а значыць, знікне працаздольнасць.

Не прыязджайце ва універсітэт занадта рана — седзячы часамі перад аўдыторыяй, дзе ідуць экзамены, вы, канешне, не папоўніце сваіх ведаў, а толькі стоміцеся і перахвалюецеся. І калі прыйдзе ваша чарга браць білет, фізічнае і разумовае перанапружанне непазбежна адаб'юцца на адказе.

Часам студэнты пытаюцца: а можна было б абысціся без экзаменаў? Бо гэта ж такая затрата сіл, нервовай энергіі...

Не, нельга! Сесія не толькі праверка вашых ведаў, вашых здольнасцей да самастойнай работы. За час навучання ва універсітэце студэнт здае некалькі дзесяткаў экзаменаў, а значыць, стольк і ж разоў рыхтуе свой адказ, звязна выкладае матэрыял, адказвае на дадатковыя пытанні. Усё гэта прывучае валодаць сабой, сваімі думкамі, мовай — выхоўвае якасці, неабходныя спецыялісту!

**Э. САРКІСЯНЦ,**
**кандыдат медыцынскіх навук.**

## ШТО СТАІЦЬ ЗА АДЗНАКАЙ

**Міхаіл Бязручанка штуршком зачыніў дзверы і выдыхнуў:**

**— Пяцёрка!**

**І адразу сябры ўзялі шчасліўчыка ў палон, пасыпаліся пытанні пра білет, пра настрой экзаменатара, яе любімыя дадатковыя і, канешне, каверзныя пытанні.**

**Калі натоўп схлынуў, я папрасіла Міхаіла, студэнта II курса фізічнага факультэта, расказаць аб падрыхтоўцы да экзамена.**

**— Зусім нядаўна мы здалі залікі, і часу на гісторыю КПСС было не шмат. Але ў мяне ўжо ёсць пэўны вопыт — гэта мая трэцяя сесія. Старанна пісаў канспект, тым болей, што Галіна Аляксееўна Калініна, кандыдат гістарычных навук, чытала лекцыі выдатна. Яна ж вяла практычныя заняткі. Напярэдадні экзамена засталося толькі як след прагледзець падручнікі, канспекты — і вось выдатная адзнака ў залікоўцы. Знешне ўсё здаецца лёгка, але за гэтай пяцёркай — няспынная падрыхтоўка на працягу семестра.**

**— І ўсё ж такі якое звяно у падрыхтоўчы перыяд ты назваў бы галоўным?**

**— Уважлівае чытанне першакрыніц. Тым, у каго экзамен па гісторыі КПСС яшчэ наперадзе, я б даў параду зрабіць глыбокі і поўны канспект работ класікаў марксізму-ленінізму.**

**— Што будзеш рабіць сёння?**

**— Адпачываць. А заўтра — зноў за падручнікі.**

**С. МІКАЛАЕВА.**

**Добра падрыхтаваліся да экзамена па антычнай літаратуры студэнты II курса вячэрняга аддзялення факультэта журналістыкі. У выніку — многа выдатных і добрых адзнак і толькі некалькі здавальняючых.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнты засяроджана рыхтуюцца да адказаў.**



**Фота Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.**



*Заканчваецца сесія ў студэнтаў завочнага факультэта аддзялення правазнаўства. Хутка яны паедуць дадому, павязуць з сабой залікоўкі, у якіх стаяць у асноўным добрыя адзнакі.*

*На здымку: экзамен па грамадзянскаму праву прымае ў студэнтаў-завочнікаў V курса аддзялення правазнаўства выкладчык юрфака В. В. ЦІХАНОВІЧ.*

*Фота Т. Петрашкевіч.*

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА



БЫЛЬ

## ЗНАЙСЦІ САБЕ СЯБРА

НЕ раз заходзіла я ў шматпавярховы дом да сваіх знаёмых. І часта сустракала на лесвічнай пляцоўцы паляўнічага сабаку. Ён важна хадзіў перад дзвярыма кватэры, ледзь-ледзь прыадкрываў сонныя вочы, калі чуліся крокі. І па ўсяму было відаць, што ён тут у сябе дома і што яму тут добра.

Але сёння я заўважыла сабаку на вуліцы. Нешта ў яго позе мяне насцярожыла.

— Арол! — ціха паклікала я.

Сабака неахвотна ўзняў галаву, слаба варухнуў хвастом. Выгляд у яго быў няшчасны.

— Арол, што з табой?! Захварэў?!

Ён устаў і з апушчанай галавой падышоў да мяне. Я прысела, памацала нос — халодны. Здарылася нейкая бяда. Дапазна прасядзелі мы з «Арлом» на лавачцы за домам. Густыя кусты бэзу надзейна схавалі нас ад цікаўных поглядаў. Сабака ўлёгся на мае ногі, і я гладзіла яго.

Думкі мае былі невясёлыя. Дамашнія жывёліны — нашы малодшыя браты, нашы бескарыслівыя і верныя сябры. Але як часта, на жаль, можна ўбачыць такі малюнак: сабака даверліва пабег за чалавекам, мо галодны, а мо шукаў сабе сябра, гаспадара. І ў адказ — злосны штуршок у бок. Ашчэраная пасць, злобнае рычанне, прыціснутыя да галавы вушы — і звер застаўся зверам. А мог бы стаць сябрам...

Назаўтра мне расказалі наступную гісторыю.

...Чалавек быў заядлым паляўнічым, і таму купіў сабе шчанё. Імя яму далі гордае і прыгожае — «Арол».

Калі шчанё падрасло і асвоіла паляўнічую навуку, выказаўшы пры гэтым незвычайныя здольнасці, гаспадар стаў браць яго з сабой на паляванне. Як чакаў і як любіў «Арол» гэтыя раннія-раннія зборы! Зоркі, бы свечы, гаслі адна за адной на святлеючым небе, лугавая росная трава абдавала свежасцю. «Арол» прынюхваўся да таямнічых пахаў лесу, прыслухоўваўся да асцярожных знаёмых крокаў гаспадара, хутка выконваў яго загады. І не адзін, не два, а многа-многа разоў прыносілі яны радасць адзін аднаму ў час удалага палявання.

Якое цудоўнае, казачнае было жыццё! Гучныя стрэлы рвалі ранішнюю цішыню наваколля, рэзкі пах пораху, трапечучыя птушкі ў траве...

На жаль, часцей за ўсё паляваў гаспадар у забаронены час, браканьернічаў, за што і быў пазбаўлены паляўнічых правоў на два гады.

Вось тут і пачалася трагедыя «Арла». «Дыскваліфікаваўшыся» за гэты час, ён стаў звычайным хатнім сабакам. З кожным годам старэў. І таму праз два гады гаспадар вырашыў купіць сабе новага паляўнічага сабаку, а «Арла» проста прагнаць.

Неяк увечары прашмыгнуў ён у шчыліну знаёмых дзвярэй і ... спыніўся. Перад ім стаяў другі сабака. «Арол» стрымана зарычаў, але нечаканы моцны штуршок нагой прымусіў яго здрыгануцца:

— Пайшоў прэч!

Яго гоняць! Ён больш не патрэбны! Можа ён у чым-небудзь правініўся? Сабака вінавата завіляў хвастом, усёй сваёй істотай просячы прабачэння. Але новы вокрык упаў на яго, як удар бізуна:

— Прэч, кажу!

«Арол» паглядзеў на свайго былога гаспадара, ціха выйшаў...

З таго часу добра знаёмыя дзверы для яго не адчыняліся. Нават кавалка хлеба не атрымліваў ён адтуль. Ён страціў апетыт, знік пругкі крок, ігрывасць, поўсць патускнела, ускудлацілася.

Увесь пад'езд перажываў за лёс сабакі. Суседзі яго не забывалі, падкормлівалі чым маглі. Але характар «Арла» стаў псавацца з кожным днём. Раней ён ніколі не брахаў на людзей, зараз злосным лаем сустракаў прахожых. Былы гаспадар, баючыся непрыемнасцей, адвёз сабаку ў лес. «Арол» вярнуўся. Ды і як яму было не вярнуцца, калі яго дом тут.

Вось такая сумная гісторыя. Звычайная гісторыя, скажа хто-небудзь. Але такія «звычайныя» гісторыі вучаць нашых дзяцей жорсткасці і чэрствасці, бязлітаснасці. Толькі хочацца верыць, што «Арол» знойдзе сабе вернага сябра сярод хлопчыкаў і дзяўчынак гэтага дома, і я зноў убачу яго вясёлым.

Т. ВОЛКАВА.

В. РОЩИН

## МОЯ ИСКОМАЯ РЕКА

*Как обожжённые ресницы,*
*Гуськом — десанты ивняка,*
*Лезо волны, чтоб мелям бриться.*
*Росли и падали на склон*
*Моих закатов помидоры.*
*Дождей зеленых макарон*
*Накаркал в небе вещий ворон.*
*Осенних паводок побег*
*В простовы пойм из плена русла,*
*И. словно выглаженный, снег*
*На льду, знакомому по хрусту.*
*Река, которую искал*
*В краях далёких и прелестных,*
*Не средь тайги, не среди скал—*
*Была ручьем длиной в окрестность.*
*Там; в просыхающих до дна,*
*Одетых в ризу рясы плёсах.*
*Печать моей ступни видна—*
*Счастливых дней последней блесной.*

## ПЕРШЫ СНЕГ

НАВЭЛА

З ДОМУ высыпалі гурбой. Шэсць дарослых маладых людзей, шэсць розных характараў. Але яны, здаецца, махнулі рукой на усялякія важнасці, якія звычайна захоўваюць дарослыя людзі. Яшчэ б — юнацтва, а гэта ж і мары, і першыя выпрабаванні на сталасць, і тыя, да хрыпаты, бясконцыя спрэчкі аб жыцці, каханні. І было цяжка не заўважыць, як іх ускалыхнула тое юнае, ад чаго бывае так хораша.

Забыты і няўдачы і маленькія жыццёвыя крыўды. Як усё цудоўна!

Наўкола вальсуе снег... Зямля ж прыціхлая, што нявеста перад шлюбам, не адразу адважваецца адзець убранне. А снег не спыняецца — кладзецца фатой.

Першы снег — як першае каханне. [illegible] прыемны і пяшчотны. Ад сустрэчы з ім — і радасці, і трывогі. Ветрык падхоплівае бахматыя сняжынкі і, як вусаты кавалер, важна, з выкрутасамі вядзе вальс.

Шасцёра, як дзеці, штурхаюць адзін другога. Хлопцы кідаюць у высокую дзяўчыну злепленыя са снегу камякі, а яна смяецца звонка-звонка. Ляцяць смяшынкі ў сінюю далячынь.

Сняжынкі пяшчотна шчыкочуць павекі, нібы тое маленькае дзіця сваімі пухнатымі ручкамі...

У гэты ж час з суседняга дома, крыху пакульгваючы, выйшаў чалавек. Пустыя рукавы паліто, запіхнутыя ў кішэні, спаласаваны, зрэзаны шрамамі твар, на якім толькі дзівам засталіся не закранутымі нос ды вочы. Ён усміхнуўся, гледзячы на гэтых вясёлых маладых людзей. Хто ведае, можа ён пазнаў у іх сваё юнацтва, а можа прыпомніў дарагое мінулае. Снег заблытаўся ў валасах гэтага чалавека — ветэрана мінулай вайны. І было цяжка адрозніць сняжынкі ад збеленай вайной сівізны.

Шасцярым весела, хораша. Звіняць акорды жыцця, узрываецца, ляціць песня. Яны не чулі глухіх выбухаў, не бачылі смяротнай размовы жалеза з жыццём і крывава-чорнага снегу.

Іграюць у паветры сняжынкі, падаюць на далоні халаднаватыя пушынкі, і зусім не заўважаюць маладыя людзі, як, спыніўшыся, стаіць і са шчырай усмешкай назірае за імі сівы чалавек.

Першы снег выпаў...

М. КУРГАНСКІ.

## ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ







Сустрэча з прыгожым... Адны і тыя ж карціны вісяць у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР, але кожны раз яны — іншыя, новыя, прываблівыя і чароўныя. Сёння на спатканне з высокім мастацтвам прывёў нас фотакарэспандэнт Анатоль БАСАЎ, студэнт І курса факультэта журналістыкі.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 04029 Заказ № 132.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.